Падтрымай "Вясну" на PATREON

Новая "перамога" ўчастковага Комара: гэтым разам 3 гады "хатняй хіміі" за каментар пад ягоным здымкам далі 50-гадовай мінчанцы

18.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, дыфамацыя



Марыну Снытко прыгаварылі да трох гадоў "хатняй хіміі" Фота: pravo.com

Яшчэ нядаўна мы пісалі пра суд над 62-гадовай Наталляй Кавалёвай з Клімавічаў. 15 лістапада яе прызналі вінаватай у абразе ўчастковага з Бабруйска Андрэя Комара за абразлівы каментар пад ягоным здымкам у "Аднакласніках", асудзілі да 1,5 года "хатняй хіміі" і спагналі 1000 рублёў на карысць пацярпелага ў якасці маральнай шкоды. 18 лістапада ў Мінску за аналагічнае злачынства ў дачыненні да таго ж участковага вінаватай прызналі ўжо 50-гадовую Марыну Снытко. Усяго ж Комар падаў парадку 50 пазоўных заяваў у суд аб абразе яго ў "Аднакласніках".

Разгляд крымінальнай справы **Марыны Снытко** пачаўся 10 лістапада. Судовае пасяджэнне вяла суддзя **Анастасія Ачалава**. Бок абвінавачвання падтрымліваў пракурор **Вялікі**.

Марыну Снытко вінавацілі ў публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем службовых абавязкаў паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса Беларусі. Летась пад пастом карыстальніцы Вольгі Карач у "Аднакласніках", у якім была размешчаны фотаздымак участковага Комара, жанчына пакінула абразлівы каментар з ненарматыўнай лексікай з нагоды знешнасці міліцыянта.

Сам пацярпелы на пасяджэнне суда не з'явіўся, але даслаў заяву з просьбай разгледзець крымінальную справу ў яго адсутнасці, дзе растлумачыў, што сведчанні, дадзеныя ім падчас следства, ён падтрымлівае ў поўным аб'ёме, і што дадаць па справе яму няма чаго. Комар настаяў на прыцягненні абвінавачанай да крымінальнай адказнасці і заявіў пазоўнае патрабаванне ў памеры 1000 рублёў *"у сувязі з тым, што пакінутым каментаром Марына Снытко зняважыла і абразіла ягоны гонар і годнасць не толькі як прадстаўніка ўлады, але і як чалавека"*. Пацярпелы падкрэсліў, што праз пакінуты падсуднай каментар пад ягоным здымкам у "Аднакласніках" ён неаднаразова сутыкаўся з нянавісцю і недаверам да яго з боку грамадзян падчас нясення сваёй службы.

"Сваім каментаром абразіць не хацела"

Падчас судовага пасяджэння стала вядома, што Марына Снытко даглядае хлопчыка з інваліднасцю 1 групы. Раней жанчына ніколі не прыцягвалася да крымінальнай адказнасці. Прадстаўляць свае інтарэсы ў зале суда Марына Снытко вырашыла без дзяржаўнага абаронцы, бо ў выпадку прызнання віны аплаціць давядзецца ў тым ліку паслугі дзяржаўнага адваката.

Падсудная распавяла, што Андрэя Комара асабіста яна не ведае.

"Проста пабачыла здымак поўнага хлопца ў міліцэйскай форме і пакінула пад ім каментар", — растлумачыла Марына Снытко.

Паводле жанчыны, яна нават не ўчытвалася ў сутнасць допіса. Ён трапіўся ёй на вочы толькі таму, што хтосьці з яе сяброў раней яго лайкнуў. Таксама падсудная выказала сваю нязгоду з тым, што сваім каментаром яна абразіла Комара.

У пракурора да падсуднай было шмат пытанняў. У прыватнасці, ён настойліва цікавіўся тым, што ў сваіх каментарах пад здымкам Комара пісалі іншыя карыстальнікі. А калі Марына Снытко адказала, што іншыя каментары яна не чытала і ў сутнасць публікацыі не паглыблялася, той прымусіў зачытаць яе апісанне допіса з выявай пацярпелага.

> *"Там што, знешнасць апісваецца?"* — настойліва задаў сваё пытанне падсуднай пракурор. Жанчына выглядала вельмі разгубленай і яшчэ раз удакладніла, што сваім каментаром яна ахарактарызавала знешнасць Андрэя Комара, але не абражала яго.
>
> *"Вы што, малюначкі, як у дзіцячым садку, глядзіце? Не чытаеце тэкст на ім?"* — гэтым разам задала пытанне суддзя, пасля чаго жанчыну зноў прымусілі чытаць чужыя каментары пад тым самым пастом.

На пачатку судовага пасяджэння падсудная заявіла хадайніцтва аб выкліку у якасці сведкі па справе **Таццяны Плехавец** — маці хлопчыка з ДЦП, якога Марына Снытко даглядае. Суд яе хадайніцтва задаволіў.

Падчас апытання сведкі жанчына распавяла, што *"Марына вельмі харошы і добры чалавек, які заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу, увесь час ездзіць у паліклінікі з маім дзіцем-інвалідам. Без яе дапамогі мне не ўправіцца"*.

На судзе разгледзелі і пісьмовыя матэрыялы справы. Сярод іх былі шматлікія ліставанні Марыны Снытко, размешчаныя допісы на ейнай старонцы ў сацсетках, у тым ліку петыцыя за адстаўку Лукашэнкі. Суддзя паведаміла, што **дадзеныя з перапіскі Марыны Снытко яны запытвалі ў Расійскай Федэрацыі**.

Паводле высноваў эксперта, каментар, які падсудная пакінула пад здымкам Андрэя Комара, утрымоўвае ненарматыўную лексіку абразлівага характару.



Марыну Снытко вінавацяць у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем службовых абавязкаў паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса Беларусі. Фота:nv-online.info

"Гэтыя сем месяцаў жыву як у страшным сне"

Пасля перапынку суд яшчэ раз запытаўся ў падсуднай пра абаронцу. Аднак жанчына ад яго зноў адмовілася. Суд адмову ад абаронцы не прыняў. Наступнае судовае пасяджэнне па справе Марыны Снытко адбылося толькі 17 лістапада. Яго вяла ўсё тая ж суддзя **Анастасія Ачалава**, аднак пракурор ужо быў іншы: бок абвінавачвання прадстаўляў пракурор **Вердыш**. А ў падсуднай ужо быў дзяржаўны адвакат — **Андрэй Кляшчонак**.

Пацярпелы на пасяджэнне суда зноў не з'явіўся. Яго паказанні зачыталі:

"Дзесьці ў траўні 2020 года Вольга Карач у сетцы "Аднакласнікі" размясціла маё фота з фразай "Гэта я сведчу супраць невінаватых". Апроч усіх каментароў, пад маім фота таксама быў каментар абвінавачванай "Ну і рожа".

> *"Не лічу, што гэты каментар абразлівы,* — запярэчыла Марына Снытко. — *Гэта мой паўсядзённы выраз, магчыма, заснаваны на моцным эмацыйным хваляванні. Бо гэта ж проста канстатаванне факту — пацярпелы сапраўды з'яўляецца буйным чалавекам. Намеру зняважыць гонар і годнасць супрацоўніка міліцыі не было. У формавым абмундзіраванні не разбіраюся, толькі марака магу вызначыць".*

Падчас судовых спрэчак бок абвінавачвання заявіў, што вінаватасць падсуднай даказаная. У якасці пакарання пракурор запатрабаваў абмежаванне волі тэрмінам на 3 гады без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, спагнаць на карысць пацярпелага Комара маральную шкоду ў памеры 1000 рублёў, дзяржмыту ў даход дзяржавы ў памеры 87 рублёў, мабільны тэлефон Марыны Снытко канфіскаваць у даход дзяржавы.

Адвакатка падсуднай акцэнтавала ўвагу на тым, што *"канструкцыя дадзенага складу злачынства прадугледжвае, што чалавек павінен ведаць, каго ён абражае. У нашым выпадку падсудная пацярпелага на ведала".*

> *"Паводле лінгвістычнай экспертызы, негатыўнае адценне яе каментара можна інтэрпрэтаваць як "несімпатычны чалавек". Прашу заўважыць, што гэтая характарыстыка не з'яўляецца абразай у сувязі са службовымі абавязкамі. Бо на працу ў міліцыю не прымаюць паводле крытэру сімпатычны чалавек ці не",* — дадаў бок абароны.

Падчас апошняга слова падсудная выказала сваё раскаянне:

> *"Гэтыя сем месяцаў я жыву як у страшным сне. Ніколі не думала, што вось гэтай фразай магу нанесці абразу чалавеку і сапсаваць жыццё сабе, сваім блізкім і людзям, якім патрэбная мая дапамога. Прашу ўлічыць маё раскаянне і не караць сурова. Я была законапаслухмянай усе свае 50 гадоў..."*

18 лістапада суд Ленінскага раёна Мінска прызнаў Марыну Снытко вінаватай у здзяйсненні злачынства паводле артыкулу 369 КК РБ ("Абраза прадстаўніка ўлады") і прысудзіў да **абмежавання волі тэрмінам на 3 гады без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу**. На карысць пацярпелага Андрэя Комара суд спагнаў з Марыны Снытко маральную шкоду ў памеры **1000 рублёў**, а таксама дзяржмыту ў даход дзяржавы ў памеры 87 беларускіх рублёў. Мабільны тэлефон падсуднай як сродак злачынства суд канфіскаваў у даход дзяржавы.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітзняволеных знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

